
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай,
каб не ўмёрлі! ***Францішак БАГУШЭВІЧ***



НАША СЛОВА

№ 45(55) • 25—30 снежня 1991 г. •

Штотыднёвік Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны
Кошт 10 кап. (па падпісцы — 5 кап.)

Поступ тыдня

У АЛМА-АЦЕ ПАДПІСАНА ПАГАДНЕННЕ АДЗІНАЦЦАЦІ РЭСПУБЛІК БЫЛОГА САЮЗА АБ СТВАРЭННІ САДРУЖНАСЦІ НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ. НАМЕЧАНА НОВАЯ СУСТРЭЧА КІРАЎНІКОЎ НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ, НА ГЭТЫ РАЗ У МЕНСКУ. БУДЗЕ АБМЕРКАВАНА ЭКАНАМІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ ЧЛЕНАМІ СНД.

ЛІДЭР ліберальна-дэмакратычнай партыі краіны Уладзімір Жырыноўскі, які гасцюе ў Менску, аб'явіў незалежнасць Беларусі фікцыяй. Яго заява выклікала рэзкі пратэст беларускіх парламентарыяў.

«НАШ ПРАЦАВІТЫ НАРОД БЯЗВІННА ПАКУТУЕ З-ЗА БЯЗДАРНАСЦІ І НЕПАСЛЯДОЎНАСЦІ ЦЯПЕРАШНЯГА, ВЫБРАНАГА ПРЫ КАМУНІСТЫЧНЫМ РЭЖЫМЕ, КІРАЎНІЦТВА», — так гаворыцца ў заяве дэпутацкай апазіцыі ў беларускім парламенце. Апазіцыя аб'явіла аб пачатку ўтварэння Ініцыятыўнага камітэта па правядзенні ўсебеларускага рэферэндуму. Яго мэта — адстаўка ўрада, перавыбары парламента.

У МІНЮСЦЕ РЭСПУБЛІКІ ЗАРЭГІСТРАВАНА ЯШЧЭ АДНА ГРАМАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ — БЕЛАРУСКАЕ ЗГУРТАВАННЕ ВАЙСКОЎЦАЎ.

БЕЛАРУСКІ ПАРЛАМЕНТ НАРЭШЦЕ ПРЫНЯЎ ЗАКОН АБ СВЯТОЧНЫХ ДНЯХ, ЯКІ ВЫКЛІКАЎ ДОЎГІЯ ДЭБАТЫ ДЭПУТАТАЎ. Законам адменены ўсе «камуністычныя» святы, адначасова прадугледжана рэлігійныя і грамадзянскія — Каляды, Вялікдзень, Дзяды і іншыя.

АДБЫЎСЯ З'ЕЗД СЯЛЯНСКАЙ ПАРТЫІ РЭСПУБЛІКІ. ДЭЛЕГАТЫ АДЗНАЧЫЛІ: УСЕ ЗАКОНЫ АБ ЗЯМЛІ НЕ ВЫКОНВАЮЦЦА.



Не першы год працуе ў школе Наталля Дзмітрыеўна Фурс. За плячыма — тысячы ўрокаў роднай мовы і літаратуры, у кожны з якіх настаўніца ўкладвала душу і сэрца. Таму і паважае ў Старых Дарогах Наталлю Дзмітрыеўну калектыў школы № 1. За парадай да знаўцы беларускага слова звяртаюцца не толькі вучні, але і педагогі.
НА ЗДЫМКУ: Наталля Дзмітрыеўна Фурс.

Фота М. ХАМЦА.

Стагоддзе « цёці Уладзі »

25 снежня спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння літаратуразнаўцы, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, жонкі Янкі Купалы Уладзіславы Францаўны Луцэвіч.

Скончыўшы педагагічныя курсы ў Варшаве, Уладзіслава Францаўна з 1908 па 1941 год была на педагагічнай рабоце. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі друкавала вершы за подпісам В. Станкевічанка. Для дзяцей дашкольнага ўзросту сабрала і апрацавала «Народныя дзіцячыя песенькі», склала «Зборнік вершаў для дашкольных установ», апрацавала народныя казкі «Як жабы бараніліся ад бусла», «Пых», «Як пеўнік казу прагнаў». Уладзіслава Францаўна з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў пра жыццё і творчасць Я. Купалы, З. Бядулі, Цёткі.

З 1944 года да канца жыцця працавала дырэктарам Літаратурнага музея Янкі Купалы.

13 снежня на радзіме Уладзіславы Францаўны ў вёсцы Вішнева Валожынскага раёна адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя юбілею. З цікавымі ўспамінамі пра «цёцю Уладзю» выступіла пляменніца Купалы Ядвіга Юліянаўна Раманоўская. Яна падарыла школе бюст Купалы, які стаяў у кватэры Уладзіславы Францаўны. Перад прысутнымі выступілі супрацоўніца музея Я. Купалы М. Чабатарэвіч, валожынскі краязнавец Г. Равінскі, супрацоўнік музея Якуба Коласа І. Курбека, актыўны сябра Валожынскай раённай рады ТБМ М. Трапашка, а таксама паэты П. Прыходзька і В. Шніп. Школьнікі малодшых класаў выканалі народныя песні, якія любіла Уладзіслава Францаўна.

Рэха

ЦІ ЁСЦЬ У ЛДП БЕЛАРУСЫ?

У Менску створаны Беларускі рэгіянальны камітэт Ліберальна-дэмакратычнай партыі СССР, ці інакш кажучы — «партыі Жырыноўскага».

Практычная дзейнасць і праграма ЛДП грунтуюцца на ідэі адзінства тысячагадовай Расіі. Ліберальныя дэмакраты, ганячы «Кароткі курс ВКП(б)», звяртаюцца да прац гісторыкаў і філосафаў Карамзіна, Салаўёва, Ключэўскага, Бярдзяева...

Падаючы справаздачу пра арганізацыйны сход ЛДП у Менску, вайсковая газета «Во славу Родины» назвала публікацыю «Ёсць у ЛДП і беларусы». Так, згодна з адзнакай ў пашпарце — ёсць. Але ж ці можна называць беларусамі людзей, якія забываюцца на ўсё беларускае, актыўна прапагандуюць расійскія вялікадзяржаўныя ідэі?

Чаму ў нас на Беларусі сваё, роднае мы заўжды адсоўваем на другі план, шукаем нейкі крымінал, калі справа датычыцца, прыкладам, таго ж БНФ? І адначасна з поўным даверам адносімся да нінаандрэеўскага неабальшавізму, да вялікадзяржаўных амбіцый псеўдабарацьбіта за дэмакратыю Жырыноўскага.

Чаму Менск гасцінна расчыняе дзверы перад усялякімі эмісарамі, для якіх чужымі застаюцца і духоўнае адраджэнне, і ідэі палітычнай, эканамічнай, нацыянальнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь? Тым больш — чужым застаецца для іх беларускае слова.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

Але!

Каб не згубіць духоўны воблік...

З нагоды адной публікацыі

Праблема адраджэння роднай мовы вельмі хвалюе нацыянальна свядомых беларусаў. Без матчынага слова народ губляе сваё духоўнае аблічча: гінуць гістарычная спадчына, нацыянальная культура, зарастаюць дзірваном вытокі этнагенезу. Праблема выжывання беларусаў як нацыі, праблема захавання мовы — прадмет шматлікіх газетных дыскусій.

Не засталася ў баку ад гэтых праблем і газета «Рэспубліка», надрукаваўшы артыкул Святланы Герасімавай «Язык — возрождение, или коллективизация?» Аўтар ва ўступнай частцы канстатуе прычыны, якія падштурхнулі яе ўзяцца за пяро: гадавіна ўступлення ў сілу Закона аб мовах і інтэрв'ю, якое даў «Настаўніцкай газеце» народны дэпутат Яўген Цумараў. Святлана Герасімава піша: «...Евгений Цумаров оптимистично высказался в том, что в Белоруссии созрели условия для ускорения реализации Закона... У меня такого оптимизма нет. А есть опасения, что язык — не та сфера, где десятилетку можно выполнить за четыре года».

З іроніяй, згадаўшы некаторыя крокі у накірунку беларусізацыі, Герасімава робіць вывад: «Чистой и красивой белорусской речи не прибавилось. Ни на улицах, ни в госучреждениях, ни даже в парламенте. А ведь язык жив не тогда, когда на него переведено делопроизводство, а когда на нём разговаривают граждане». З першай часткай сцвярджэння можна згадзіцца, аднак з другой — ніяк нельга. Чамусьці Святлана Герасімава не імкнецца раскрыць вытокі прычын, а коўзаецца па паверхні фактаў. Трэба ж называць рэчы сваімі імёнамі.

У сённяшняй сітуацыі асноўная віна наменклатуры. Гэта ж менавіта яна дружна праводзіла «калектывізацыю» ў справе русіфікацыі беларускамоўных школ. Партапаратчыкі былі і супраць прыняцця Закона аб мовах. Яны і сёння сваімі паводзінамі тармозяць адраджэнне роднага слова.

Вось і С. Герасімава абараняе тэзіс, што перавод справаводства на беларускую мову нічога не дасць. Падобны песімізм — бальзам для нацыянальных нігілістаў. Але ж ужо сам факт пераводу справаводства на беларускую мову з'явіцца штуршком да яе авалодання. Бо той, хто займае пэўную пасаду, будзе зацікаўлены вывучаць мову, каб не згубіць працу.

Святлана Герасімава беспадстаўна прыніжае ролю школы ў адраджэнні матчынай мовы: «Возрождать и реализовать закон решили с системы образования, рассудив до гениальности просто: заговорит по-белорусски детский сад и школа — заговорит и республика». С. Герасімава сумняваецца ў гэтым. На яе думку, гэтага нельга ажыццявіць «... в отсутствии белорусскоговорящего демократического общества». Маўляў, стварыце спачатку беларускамоўнае грамадства, тады можаце і матчыную мову ў школе адраджаць. Пакуль жа не будзе выканана гэтая ўмова, то лепей не чапайце школу.

Аргументы не арыгінальныя. Нешта падобнае пісала ўжо і баранавіцкая раённая газета «Знамя коммунизма»: «навучыце спачатку бацькоў размаўляць па-беларуску, а тады ўжо няхай яны вучаць сваіх дзяцей матчынай мове».

А вось якім шляхам зрабіць нешта — адказу я не знайшоў ні ў баранавіцкай газеце, ні ў артыкуле Герасімавай. Праўда, у выступленні апошняй ёсць пэўныя намёкі... І, у прыватнасці, такі, што «языковая проблема решается вначале политически, затем экономически, а уже потом — образовательно» (?!). Вось дык расшыфроўка.

Цяжка сказаць, для чаго спатрэбіўся гэткі артыкул газеце «Рэспубліка»: ці то эпітафія на жывую, не жадаючую паміраць, гаротніцу-мову, ці то чарговы фіксатар для замацавання нацыянальнага нігілізму ў плямені манкуртаў...

В. СОКАЛ,
выдатнік народнай асветы,
Ляхавіцкі раён.

ВЫБРАНЕЦКАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СЛУЖБА ПАВЕДАМЛЯЕ

Разам з Украінай у рэферэндуме па пытанні незалежнасці сваёй Радзімы прынялі ўдзел таксама ўкраінцы Масквы і Маскоўскай вобласці (каля 500 тысяч чалавек), а таксама людзі іншых нацыянальнасцей, якія родам з Украіны. Арганізатарамі гэтай акцыі выступілі Украінскае прадстаўніцтва ў Маскве і Таварыства украінскай культуры, беларускія мясцовыя арганізацыі былі запрошаны ў якасці назіральнікаў, «як прыхільнікі ідэі незалежнасці і найбліжэйшыя саюзнікі». Са слоў спадара Генадзя Леха, намесніка старшыні Маскоўскай рэгіянальнай арганізацыі БНФ, нам стала вядома, што людзей было вельмі шмат, чарга да урнаў выходзіла на вуліцу, цэлы дзень спяваліся нацыянальныя песні. Вынікі рэферэндуму ў Маскве наступныя: 95 працэнтаў удзельнікаў прагаласавалі за незалежную Украіну. «Мы ўважліва назіралі за арганізацыяй і ходам праведзення акцыі, бачылі ўсе памылкі і вучыліся, бо і ў нас наперадзе — незалежнасць»,— сказаў Г. Лех.

* * *

Цікавай справай заняліся ў Батчанскім Доме культуры Кобрынскага раёна. Дырэктар ДК У. Шабліцкі, перагаварыўшы з мясцовымі аматарамі мастацкай самадзейнасці, сярод якіх большасць людзей сталага ўзросту з вёскі Літвінкі, вырашылі адрадзіць і перадаць моладзі бацькоўскія песні, абрады і традыцыі. Створаны калектыў назвалі «Літвінянка». З поспехам прайшло ўжо некалькі тэматычных праграм: «Вячоркі», «Дажынкі», «Ткачыхі». Рыхтуецца і новая праграма — «Вяселле».

* * *

З 2-га па 5-е снежня праходзіла Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Беларуская народная харэаграфія: захаванне і шляхі развіцця». Былі прачытаны даклады навукоўцаў і дзеячаў культуры па дадзенаю тэму. Адбыўся фальклорны канцэрт. Канферэнцыю рыхтавалі Міністэрства культуры РБ і Беларускі інстытут праблем культуры.

* * *

13 снежня ў Міёрскім касцёле на багаслужэнне, прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, сабралася каля 500 чалавек. Імшу вёў Уладас Пятрайціс на беларускай мове. Затым адбылася літаратурная вечарына, у якой прынялі ўдзел рэдактар газеты «Голас душы» Ірына Жарнасек, пісьменнік Навум Гальпяровіч, настаўнік гісторыі сп. Ярмоленка. Уразіла тое, што «Пагоню» спявалі і людзі сталага ўзросту.

* * *

Урэшце з'явілася першае афіцыйнае выданне, якое поўнасцю перайшло на «тарашкевіцу» — штомесячнік для падлеткаў «Бярозка».

* * *

28 лістапада ў Брэсцкім педагагічным інстытуце адбыўся ўстаноўчы сход па заснаванні Беларуска-польскага навуковага таварыства. Мэта таварыства — аб'яднаць намаганні навукоўцаў, якія займаюцца праблемамі рэгіёна «Палессе — Падляшша», дзеля больш плённай працы. Ініцыятары мяркуюць, што да іх далучацца навукоўцы з Гомеля, Мазыра, Любліна, Беластока і іншых гарадоў.

* * *

З 5-га па 11-е снежня ў Менску праходзіў Другі Міжнародны фестываль эксперыментальных тэатраў «Студыйныя Каляды-91». Ягонымі арганізатарамі выступілі Асацыяцыя тэатраў-студый і Саюз тэатральных дзеячаў. У фестывалі бралі ўдзел калектывы з Летувы, Расіі, Германіі, Польшчы і, вядома, з Беларусі. Адкрыў «Студыйныя Каляды-91» спектакль Я. Кофта «Сялянская вайна», які паставіў тэатр-студыя «Дзе-Я».

* * *

11-га снежня ў Беларускім тэхналагічным інстытуце праходзіў чарговы міжпартыйны семінар «Шляхі беларускага адраджэння». Яго наладзілі НДПБ, БНФ і БХЗ. Тэмай пасяджэння было «Адраджэнне нацыянальнай беларускай царквы». На Беларусі адно з самых складаных пытанняў — міжканфесійнае, і гэта цудоўна разумелі ўсе дакладчыкі. Таму добра, што гутарка не перарасла ў рэлігійную спрэчку. Па гісторыі уніяцкае царквы выступілі Юры Хадыка і Леанід Лыч. Пра праваслаўе распавядаў Алег Бембель і айцец Ігар — святар Менскага кафедральнага сабора. Вельмі цікавым было і выступленне пратэстанта Лявона Ліпеня. На жаль, як заўсёды бывае, час выйшаў, і не былі заслуханы ўсе дакладчыкі. Таму семінар працягнецца 25-га снежня а 18-ай гадзіне ў 132 пакоі 4 корпуса БТІ.

* * *

Як стала вядома, прадстаўнікі «народна-патрыятычнага саюза «Белая Россия» разам з прадстаўнікамі яшчэ чатырох манархічных арганізацый, якія дзейнічаюць у Расіі, вырашылі стварыць манархічную партыю. Ужо на снежань запланаваны ўстаноўчы з'езд. Ды дзіўная атрымліваецца сітуацыя. Новаспечаныя манархісты лічаць, што пры ўвядзенні самаўладства не павінна быць ніякіх парламентаў. Сярод арганізатараў партыі ёсць і народны дэпутат СССР. Вось такі атрымліваецца «ўласны прыклад». Варта яшчэ напомніць «господам», што мы з імі жывём на розных баках мяжы. Мяжы, што раздзяляе дзве незалежныя дзяржавы.

* * *

Выйшаў у свет чарговы нумар газеты «Зважай» — выданне беларускіх эмігрантаў у Канадзе. Гэты нумар змяшчае наступныя матэрыялы: артыкул Язэпа Барэйкі «Змаганне за незалежнасць», прысвечаны 71-ым угодкам паўстання супраць бальшавікоў на Случчыне; пачатак гістарычнага нарыса Генадзя Сагановіча «Полацкая вайна, 1563—1579 г.г.»; інтэрв'ю з палкоўнікам Статкевічам і шмат і іншае. Са згоды рэдакцыі на Бацькаўшчыне выданне рэпрадукуе выдавецкае агенцтва «Дзянніца» Задзіночання Беларускіх Студэнтаў. Жадаючыя аформіць падпіску на «Зважай» і набыць папярэднія нумары могуць звяртацца на адрас: 220102, Беларусь, Менск-102, а/с 212, ЗБС. Менчукі могуць набыць выданне ў шапіку Таварыства беларускай мовы, што насупраць ГУМа.

* * *

5 снежня ў Брэсцкай абласной бібліятэцы прайшло свята, прысвечанае М. Багдановічу, якое падрыхтавалі і правялі студэнты філфака педагагічнага інстытута. Была наладжана выстава пра жыццё і творчасць юбіляра. Госці свята маглі набыць беларускую прэсу.

* * *

9 снежня адбылося гарадское «Свята Максіма». Жыхары Брэста ўдзячны акцёрам тэатра драмы, якія паставілі цікавую літаратурна-музычную кампазіцыю. На свяце выступілі мясцовыя паэты і барды з сваімі творамі. На кожнай імпрэзе гучала «Пагоня».

* * *

З 5-га лістапада летувіскія дэпутаты (усіх узроўняў) што не вызначыліся ў прыняцці грамадзянства Рэспублікі Летува, пазбаўлены сваіх паўнамоцтваў згодна з адпаведным законам.

Падрыхтавалі
Андрусь ВАШКЕВІЧ,
Ігар МІХНО,
Вольга МІХАЙЛІК,
Ігар БАРАНОЎСКІ.

Не ўсё, што існуе, разумна

Калі я дастаю са сваёй шафы «Краёвы слоўнік Усходняй Магілёўшчыны», то заўсёды ўспамінаю яго аўтара — Івана Бялькевіча. Гэта пра яго ў прадмове да слоўніка напісана: працаваў вучоным спецыялістам слоўнікавай камісіі, неўзабаве яму прыйшлося назаўсёды пакінуць Беларусь і перайсці на працу тэхнікам- нарміроўшчыкам на лесазаводзе. Слоўнік жа, галоўную яго працу, вымушана была выдаваць жонка пасля смерці аўтара.

Цяжка паверыць: за вывучэнне роднага слова — ссылка. А колькі такіх, з паламаным лёсам, можна назваць моваведаў, настаўнікаў, краязнаўцаў!..

Аўтары вядомай формулы ў вызначэнні культуры, пэўна, ганарыліся сваёй вынаходлівасцю: «Нацыянальная па форме...» Сапраўды, гістарычная заваёва: газета «Советская Белоруссия», часопіс «Коммунист Белоруссии», «кіностудия «Беларусьфильм». Усё кругом адно беларускае.

А паспрабуй засумнявайся — лёс усіх андэрсэнаўскіх хлопчыкаў добра вядомы. Вось і стваралася такая нацыянальная культура, якой пад сілу было кіраваць нават іншапланецяніну.

Таму яшчэ і сёння ў нашым парламенце на рускай мове людзі са спакойным сумленнем абмяркоўваюць лёс беларускамоўных сродкаў масавай інфармацыі. А ці ведаюць яны, што гэта такое? Колькі жыццяў аддадзена ў нас за сваю любоў да матчынага слова. З якім страхам глядзяць і цяпер вопытныя бацькі на тых андэрсэнаўскіх хлопчыкаў, што са шчырым пачуццём цягнуцца да роднага слова.

Колькі сродкаў выдзялялася ў нас на знішчэнне натуральнага імкнення людзей гаварыць пасвойму! Дык ці можна шкадаваць іх, гэтыя сродкі, цяпер, калі ўпершыню за многія вякі афіцыйна загаварылі аб падтрымцы беларускамоўных выданняў? Гаворка ўжо не ідзе аб заканамерным пакаянні. Аб аплочанасці сённяшніх выдаткаў учарашнімі ахвярамі. Проста сама разумнасць падыходу, рэдкая ў нашай гісторыі, патрабуе аператыўнай падтрымкі.

І калі не ўсе дэпутаты беларускага парламента паспяшаліся выкарыстаць гэтую рэдкую магчымасць, перанеслі пытанне на лютаўскую сесію, то гэта лішні раз засведчыла: разумныя меры вельмі цяжка прабіваюць сабе дарогу.

Анатоль СІЛЯНКОЎ.

Даруй нам, Божа!

На месцы былых старажытных могілак у Маладзечне, зруйнаваных у 1976 г., пабудавана каплічка. Ініцыятарам гэтай акцыі, якая мела назву «Пакаянне», выступіла Маладзечанская рада ТБМ імя Ф. Скарыны. Аўтары праекта — мастак Святаслаў Палівода і архітэктар Юры Белановіч.

Помнік пабудаваны на ахвяраванні грамадзян, сродкі Маладзечанскай рады і некаторых прадпрыемстваў. 14 лістапада пасля асвячэння капліцкі, адбылася царкоўная і грамадзянская імша. Святары маліліся не толькі за тых, хто быў пахаваны тут, але і за тых, у каго няма магіл.

С. ЗАМКАВЫ.

З памяццю ў нас пакуль не вельмі

Піша вам чытач з Рыгі, дзе жыву і працую, а родам я з Беларусі. Нядаўна быў у гасцях у сваёй сястры ў Брэсце. А перад ад'ездам з Латвіі я прачытаў у «Нашым слове» вельмі цікавы матэрыял «Загадка Паўлюка Багрыма» М. Маліноўскага. Сам сабе адзначыў: напісана ўлюбёным краязнаўцам. Вельмі вам удзячны за гэтую публікацыю. Уражанне ад «Загадкі Паўлюка Багрыма» было такім вялікім, што з Брэста, я з'ездзіў у Крошын (паўстанак «Пабеда»).

Высветліў сумны факт: у Крошыне пра свайго земляка, аказваецца, не ведаюць. Могілкі не агароджаны. Мерапрыемстваў з нагоды стагоддзя з дня яго смерці не было. Я прагледзеў таксама падшыўкі газет «Звязда», «Советская Белоруссия», «Народная газета», «Рэспубліка» — што там? Ігнаравалі. Як быццам на Беларусі такога паэта як Паўлюк Багрым наогул не было. І толькі «Наша слова» і «ЛіМ» ушанавалі яго памяць.

Лявон КАЛЯДА,
падпісчык
«Нашага слова»,
сябра таварыства
«Світанак» у Рызе.

Экзотыка па-докшыцку

У Докшыцкім раёне побач з іншымі дэфіцытамі існуе і дэфіцыт на роднае беларускае слова. А як жа інакш растлумачыць той факт, што тут і днём з агнём—быццам пальмы на Поўначы — не знайсці газету «Наша слова», не ў вялікай пашане і «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», часопісы «Полымя» і «Маладосць». А самай экзатычнай (па колькасці падпісчыкаў) з'яўляецца «Наша слова».

І гэта ў раёне, дзе пераважную колькасць насельніцтва складаюць беларусы, дзе ёсць 41 школа, з якіх толькі ў чатырох навучанне вядзецца на расійскай мове (ды і тыя пераходзяць на беларускую), дзе працуюць два мастацкія калектывы, якія носяць назву народных, нарэшце, дзе амаль у кожнай школе існуе суполка Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, выпісваецца толькі... адзін экземпляр «Нашага слова».

Газета з першых нумароў друкуе цікавыя матэрыялы і па гісторыі Беларусі, і па гісторыі роднай мовы. Якраз тыя матэрыялы, якіх не хапае як настаўнікам, так і вучням.

Крыўдна ўсведамляць, што ні раённая суполка ТБМ імя Ф. Скарыны, ні пярвічныя суполкі ў школах не зацікавіліся газетай. Але ж хто, як не яны, павінны дбаць аб распаўсюджванні сярод падпісчыкаў свайго друкаванага выдання, эпіграфам да якога з'яўляюцца эмацыянальна-ўзнёслыя словы Ф. Багушэвіча: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!»?

Пакуль жа ў Докшыцах, ва ўсім раёне, відаць, нікому няма і справы да адраджэння роднай мовы.

І. ФУРСЕВІЧ.

ЦІ ВЫРАТУЕ БЕЛАРУСКУЮ

Дэтэктыў... Сёння ўжо ўсур'ёз можна развважаць пра існаванне гэтага жанру ў беларускай літаратуры. Але ж ці здольны адыграць дэтэктыў належную ролю ў справе адраджэння беларускай мовы? Пра гэта гутарка нашага карэспандэнта з маладым празаікам Юрыем Стан-

— Нядаўна ў мае рукі трапіла менская раённая газета «Наша жыццё», дзе надрукаваны першы беларускі трылер «Паляўнічыя цішы». Аўтар — Юрый Станкевіч. Прачытаў. Цікава. Але ж чаму публікацыя толькі ў раённай газеце?

— Трылер — слова англійскага паходжання, якое азначае «моцнае ўражанне», «трымценне». Адсюль трылер — моцны «баявік». Да жанру трылера можна аднесці і «Дзікае паляванне караля Стаха», і «Чорны замак Альшанскі» Уладзіміра Караткевіча. Толькі напісанае Караткевічам усё ж бліжэй да класічнай літаратуры.

Пальцы кнігарань ломяцца ад замежных, не заўсёды трапна перакладзеных на расійскую мову дэтэктываў. Тысячэйшая калька! А тым часам наша сённяшняе жыццё — суцэльны дэтэктыў. То чаму не пісаць захапляюча пра ўсё, што навокал, на роднай мове?

Што тычыцца майго выбару месца для публікацыі «Паляўнічых цішы», то больш нідзе я і не мог надрукавацца. Малыя выдавецкія прадпрыемствы прапаноўваюць перапісаць па-расійску, а я не хачу. У часопісах і дзяржаўных выдавецтвах планы распісаны на пяць гадоў наперад.

— А калі б вас, напрыклад, назначыць дырэктарам выдавецтва, то як бы вы ратавалі беларускую кнігу?

— Да гэтай пасады мне як да арабскага шэйха. Але калі гаварыць па сутнасці пытання, то, падаецца, што самы разумны дырэктар сам па сабе беларускую кнігу не выратуе. Дапамагчы могуць толькі рашэнні парламента і самасвядомасць народа. Але ж у парламенце шмат кансерватыўных людзей. І дарэмна тады спадзявацца, што беларусы па пашпарце адродзяць нашу мову.

Нядаўна размаўляў з выкладчыцай музычнай школы. Сама — руская. Муж — беларус. Дык яна аж вішчала: «Ни за что не буду говорить на этом языке! А то соберусь и тут же уеду в Россию! И детей — ни своих, ни чужих? этой «мове» учить не буду!»

І калі ў нас у Беларусі жыве дзесяць-пятнаццаць працэнтаў рускіх, то няхай і такая ж частка кніг выходзіць на іх мове.

— Ці можна ўжо зараз гаварыць пра традыцыі беларускага дэтэктыва?

— Пра традыцыі пакуль што гаварыць рана. На дэтэктыўнай тэматыцы працуюць маладыя празаікі М. Шайбак, М. Клімковіч, А. Усеня... Да гэтага жанру звярталіся А. Жук, В. Супрунчук.

— Ваш трылер мяне зацікавіў формай твора, нязвыклай манерай у пабудове дыялогаў, зацікавілі і свядомыя парушэнні традыцыйных норм правапісу. Гэта ўсё вы рабілі знарок ці гэта асаблівасці новага для беларускай літаратуры жанру?

Шаноўная рэдакцыя «Нашага слова»!

Мне трэба было набыць беларускі каляндар, але нідзе ў Менску я не змог яго знайсці. Адзін мой былы сусед. які цяпер жыве ў Злучаных Штатах Амерыкі, звярнуўся да мяне з просьбай даслаць яму некалькі беларускіх каляндарыкаў і паштовак. Я яшчэ раз абышоў шмат кіёскаў і кнігарняў, але іх так і не знайшоў.

Можа Вы ведаеце, дык падкажыце, дзе ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь знайсці беларускія каляндарыкі і паштоўкі? Ці можа гэта наогул неіснуючая ў прыродзе з'ява? Тады чаму не выконваецца «Закон аб мовах»? Да якога часу беларусы на Беларусі будуць падвяргацца дыскрымінацыі?

Васіль РЫЧЫК. г. Менск.

Галоўны мастак выдавецтва «Беларусь» Генадзь Іванавіч Мацур паведаміў, што, пачынаючы з мінулага года, група мастакоў інтэнсіўна працуе над эскізамі беларускіх паштовак. Ужо ў гэтым годзе паступілі ў гандаль беларускія віншавальныя паштоўкі і паштоўкі з выявай нацыянальнай сімволікі, у прыватнасці «Пагоні», а таксама камплект «Гродна на старых паштоўках». Вядзецца распрацоўка эскізаў, якія прысвечаны святам. Так у гэтым годзе ўжо выйшла паштоўка «Вялікдзень», а ў наступным выдавецтва плануе выпусціць паштоўкі да Новага года, да дня нараджэння, да 8 Сакавіка, «Добра жыць ды не тужыць» (да вяселля), «З калядкамі — добрымі святкамі», «Дзяды» і іншыя.

Далей Генадзь Іванавіч падкрэсліў, што яны зацікаўлены выдаваць нацыянальныя паштоўкі вялікімі тыражамі ад 50 да 100 тысяч. Але на самай справе тыраж не перавышае і 5 тысяч. Прычын некалькі. Адна з іх — адсутнасць якаснай паперы. Яна паступала ў асноўным з-за мяжы, у прыватнасці з Фінляндыі. Цяпер даводзіцца выкарыстоўваць толькі старыя запасы з мінулых гадоў. На наступны год паперы яшчэ няма. Дзяржкамдрук не забяспечыў. Відаць, давядзецца купляць самім па высокіх цэнах на біржах. Другая прычына — незацікаўленасць Упраўлення кніжнага гандлю «Белкнігі» ў распаўсюджванні нацыянальных паштовак, якое праводзіць экспертызу і вырашае (зачастую ў асобе аднаго чалавека), што паштоўкі купляцца не будуць, і... памяншаецца тыраж з 50 да 5 тысяч.

Што датычыць беларускіх каляндароў, то Генадзь Іванавіч адзначыў, што ў мінулым годзе выйшаў адрыўны каляндар на 1991 год «Родны край». У ім змешчана інфармацыя пра важнейшыя даты і падзеі, звесткі пра гісторыю, культуру, народную гаспадарку Беларусі, карысныя парады па вядзенні хатняй гаспадаркі, выхаванні дзяцей. Такі ж каляндар будзе выпушчаны і на 1992 год. Плануецца выхад «Беларускага народнага календара» на 1993 год. Нацыянальныя абрады, звычаі, прыкметы, паверʼі, прыказкі складаюць змест гэтага насценнага календара з 12 лістоў. На першай старонцы кожнага ліста мастацка-вобразнае ўвасабленне падзей і з'яў месяца, на другой (адваротнай) — тэкставы матэрыял.

Выдавецтва «Беларусь» мае сваю кнігарню ў падземным пераходзе на станцыі метро «Плошча Перамогі», дзе можна набыць беларускія паштоўкі і календары.

Л. БАРШЧЭЎСКАЯ.

СЛОВА... У ВАЙСКОВАЙ ФОРМЕ

«Наша слова» — штотыднёвае выданне. Яму ў гэтым сэнсе не стае аператыўнасці. Да таго ж, пагадзіцеся, мы маем і абмежаваную колькасць чытачоў. Тым болей — у вайсовым асяродку. Таму аўтар гэтых радкоў і вырашыў расказаць пра працу Сержука Чыслава чытачам акруговай газеты «Во славу Родины». Матэрыял «Родная мова... в военном мундире» і быў надрукаваны на яе старонцы ў дзень адкрыцця I з'езда Беларускага згуртавання вайскоўцаў — 12 кастрычніка 1991 года.

Газета ж «Звязда» зрабіла пераклад і перадрук матэрыялу з расійскага тэксту, не ўзгадніўшы публікацыю з аўтарам. Пры гэтым быў дапушчаны шэраг памылак, аб чым і лічу сваім абавязкам папярэдзіць чытачоў.

З Сяржуком Чыславым мы пазнаёміліся на адным са сходаў Беларускага згуртавання вайскоўцаў. Лейтэнант запасу. За плячыма — вучоба ў Менскім вышэйшым вайсковым інжынерным зенітна-ракетным вучылішчы, служба на адной з «кропак» у далёкім Забайкаллі. І як пастаянны спадарожнік — цікаўнасць да роднай мовы, да ўсяго беларускага. А ў выніку карпатлівая праца па складанні практычнага тэрміналагічнага вайсковага слоўніка на роднай мове.

— Прызнацца, я, мусіць, таксама з таго пакалення,— кажа спадар Сяржук,— што не нарадзілася з патрыятычнымі настроямі, а набывала любоў да роднай мовы, да культуры пад уплывам нейкіх важных падзей у краіне і свеце. Са мною было так. Служыў далёка ад Беларусі. Былі там землякі, але паяднання паміж намі, беларусамі, не адчувалася. Збяруцца разам армяне, узбекі — абавязкова гавораць па-свойму. А мы быццам сваёй мовы не ведаем, і ўвогуле саромеемся таго, што беларусы.

— Але калі было гэтакае адчуванне, ці не спрабавалі вы неяк усё ж аб'яднаць землякоў, згуртаваць з дапамогай роднага слова?

— Яшчэ напрыканцы вучобы ў Менскім вайсковым вучылішчы я са сваімі аднадумцамі паспрабаваў стварыць беларускую суполку. І ведаеце, нешта зварухнулася ў людзях! Сам характар іхніх думак стаў мяняцца. Хаця і здзіўляла (як і цяпер працягвае здзіўляць) нейкая «каўбасная» псіхалогія многіх равеснікаў. Што, маўляў, мова, калі есці няма чаго... А мо таму і есці няма чаго, што пра мову ў свой час не паклапаціліся?..

— Сяржук, ведаю, што вы займаецеся стварэннем беларускага вайсковага слоўніка.

— Па-першае, я ўпэўнены, што ў недалёкай будучыні Беларусь будзе мець уласнае нацыянальнае войска. А калі так, то не на замежнай жа мове давядзецца весці ў ім прафесійную гаворку... Пра стварэнне вайсковай тэрміналогіі на беларускай мове клапаціліся нашы суайчыннікі яшчэ ў дваццатыя — трыццатыя гады. У прыватнасці, 1927 годам пазначана праца М. Байкова і А. Бараноўскага «Практычны беларускі вайсковы слоўнік. Частка 1. Расейска-беларуская». А ў 1933 годзе быў выдадзены «Ваенны руска-беларускі слоўнік». Яго ўкладальнікі, праўда, залічылі сваіх папярэднікаў у «нацдэмы». Але гэтым сабе будучыню не забяспечылі — загінулі і яны ў ГУЛАГу. Зазначу, што за той невялікі прамежак часу было зроблена шмат. Ваенная камісія, дарэчы, працавала яшчэ пры Інстытуце беларускай культуры. Тады ж Дзяржаўнае выдавецтва БССР мела ваенную рэдакцыю. Накладамі ад пяці да дзесяці тысяч паасобнікаў выдаваліся брашуры, падручнікі для малодшых камандзіраў. Літаратурная, публіцыстычная творчасць вайскоўцаў аб'ядноўвалася ў калектыўныя зборнікі.

— Вы расказваеце ўсё гэта, а я думаю, што ў наш час уся «ўра-патрыятычная» літаратура пра армію выдаецца выключна на рускай мове. Летась было заяўлена, што выданне маладзёжнага вайсковага часопіса «Баявы таварыш» будзе беларускамоўным. Дакладней кажучы, збіраліся маскоўскі часопіс «Боевой товарищ» выдаваць і па-беларуску. А мо так яно і добра, што на тым абяцанні ўсё скончылася. Усё адно той часопіс не стаў бы беларускім, таму што няма дасканалых беларускіх найменняў вайсковай тэрміналогіі.

— Гэта не зусім так. Найменні ў большасці сваёй ёсць. Слоўнік 1927 года — база і для маёй працы. Перш чым уводзіць наватворы, патрэбна як след уважліва агледзець зробленае папярэднікамі. Шмат цікавых знаходак, дарэчы, сустрэлася мне ў «Страявым статуце», выдадзеным у 1943 годзе ў Менску. Склаў яго Віталь Мікула, артылерыйскі афіцэр. Зразумела, што карыстаўся ён найперш нямецкай вайсковай тэрміналогіяй. І тым не менш узнікае ўражанне, што «Страявы статут» у некаторай ступені калька з савецкіх вайсковых статутаў. Дарэчы, мова наша багатая, у ёй даўно бытуюць многія тэрміны вайсковай лексікі. Услухайцеся хаця б у такія словы. Прысяга-прырачэнне. Мотастралок — воін-драб, альбо драб. Пяхота — драбы. Ці вось як у Ластоўскага: строй — шыхт. А каманды з страявога статута: шыхтуйся! Зважай!.. А нашыя часопісы, газеты, мастацкая літаратура карыстаюцца па-звычцы калькай з расійскай мовы.

— Сяржук, а ці можна сёння спадзявацца, што сабраныя табою беларускія вайсковыя найменні ўвойдуць у маўленне вайскоўцаў?

— На гэта пытанне адкажу так: слоўнік я адправіў на рэцэнзію ў... Казахстан. Хто пастаянна чытае «Наша слова», той не здзівіцца і зразумее, у чым справа. Мой кваліфікаваны і зацікаўлены рэцэнзент — падпалкоўнік Станіслаў Суднік, шчыры руплівец на ніве адраджэння беларускай мовы. Дарэчы, ён і сам займаецца складаннем беларускага вайсковага слоўніка...

— Прыемна, што ваша праца мае такіх прыхільнікаў.

— Больш таго, я спадзяюся яшчэ і на беларускае замежжа. Як ні дзіўна, беларуская вайсковая тэрміналогія шырока выкарыстоўваецца ў эміграцкім друку. У прыватнасці, газету «Зважай» з поўным правам можна назваць беларускай вайсковай газетай. Такога выдання, на жаль, мы ў сябе не маем. Вайсковая тэрміналогія — прадмет зацікаўленасці Беларускага Вызвольнага Фронту, штаб-кватэра якога знаходзіцца ў Аўстраліі.

— Казахстан, Аўстралія, Амерыка... А ў нас на Беларусі ці робіцца што?

— Адзінае, што мы маем на сённяшні дзень, дык гэта пашырэнне ўжытку вайсковай тэрміналогіі ў асяродку скаўцкага руху. І ўсё ж бачанне перспектыў у мяне самае шырокае, бо мы цяпер незалежныя, а значыць, гаспадары ў сваім доме. Стварэнне нацыянальнага войска стане стымулам для навукоўцаў і аматараў распрацоўваць і выдаваць тэрміналагічныя вайсковыя слоўнікі для практычнага ўжытку.

— Дзякуй, Сяржук, за размову. Спадзяюся, што не за гарамі той час, калі мы будзем мець грунтоўны беларускі слоўнік вайсковай тэрміналогіі.

Распытваў
Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

МОВУ ДЭТЭКТЫЎ?

— Балтскі этнагенез яшчэ моцна прысутнічае ў беларусах. Вучоныя кажуць, што кітайцы і менавіта беларусы найменш паддаюцца асіміляцыі. Але... сказаў жа неяк колішні «галоўны» камуніст рэспублікі А. Малафееў, што ён «не видит особой разницы между русским и белоруссом». Да нас едуць люмпены, няўдачнікі, а следам і злачынцы з усіх куткоў былога СССР. Мы ж... «талерантныя». Эмісары з Каўказа шнырають па нашых гарадах і вёсках, наладжваюць мафіёзныя структуры, ствараюць капітал. Прыклады?

Нядаўна ў Барысаве каўказцы прапанавалі 12 мільёнаў рублёў за гарадскі Дом быту. Цынічна дадалі, што гатовы набыць яго разам з рабочымі. Толькі, маўляў, жанчын старэй за 30 гадоў ім не трэба. Дзе і які народ сцерпіць гэткую абразу?!


Герой майго дэтэктыва сышчык Антон Лашкевіч змагаецца супраць мясцовых і «залётных» злачынцаў. Ён — дэтэктыў-інтэлектуал, бо мае свае, дакладна вызначаныя арыенціры ў палітычных варунках. Будучы «кандыдатам у супермены», Антон дзейнічае падобна да героя курасаваўскага фільма пра самураяў: прама і непахісна змагаецца са злом. Жорстка ўсё — і змаганне, і само дабро, але ж такі час. Дабро абавязкова павінна перамагчы.

Так, у маім дэтэктыве крыху нязвыклая канструкцыя сказаў, дыялогаў. Але ж гэтая «амерыка» ўжо адкрыта Дэлібесам і іншымі. Што ж датычыцца моўных наватвараэнняў, то яны будуць і павінны быць. У нашай літаратуры амаль не распрацаваны блатны жаргон ці так званая «феня». Даводзілася бываць у «зоне», сустракацца з блатнымі. Наша беларуская «феня» шмат у чым розніцца ад расійскай. У нас гавораць: «пысу распішу». А рускія: »морду попишу» і г. д. А без жывой жа мовы, пагадзіцеся, тканіна сказа вельмі і вельмі штучная.

Хочацца верыць, што з часам беларусы будуць чытаць дэтэктывы на роднай мове, і беларускія пісьменнікі не будуць у ролі чужых у сваёй краіне.

Распытваў
Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

«Беларашн рэв'ю»


BYELORUSSIAN
REVIEW

Выйшаў апошні ў гэтым годзе нумар англамоўнага штоквартальніка «Беларашн рэв'ю». На першай старонцы — слова ад рэдакцыі, дзе паведамляецца пра важнейшыя падзеі на Бацькаўшчыне: абвяшчэнне незалежнасці Беларусі, новую яе назву — Рэспубліка Беларусь, зацвярджанне беларускага нацыянальнага бел-чырвона-белага сцяга і старажытнага герба «Пагоня». Тут жа рэдакцыя выказвае свае спадзяванні, што цяпер, магчыма, усталююцца цесныя сувязі з іх карэспандэнтамі ў Беларусі, паколькі да гэтага часу матэрыялы часта падлягалі цэнзуры і не даходзілі ў Злучаныя Штаты Амерыкі.

Пад рубрыкай «Думкі і назіранні» змешчаны артыкул галоўнага рэдактара бюлетэня Джо Прайса «Незалежнасць Беларусі». У ім ён робіць кароткі экскурс у гісторыю Беларусі, падрабязна апісвае дзейнасць парламенцкай апазіцыі ў тыя крытычныя жнівеньскія дні, калі яна выступіла ў абарону дэмакратычных перамен. Апублікавана таксама інтэрв'ю з народным дэпутатам Рэспублікі Беларусь У. Новікам. Ён у верасні г. г. наведаў Злучаныя Штаты. Да ўвагі чытача прапанавана таксама інтэрв'ю амерыканскага кангрэсмена Д. Рорабакера пра распад Савецкага Саюза, якое ўжо надрукавана ў адным з папярэдніх нумароў «Нашага слова».

Пад рубрыкай «Погляды» змешчаны артыкул П. Рагача «Лацінская версія беларускага алфавіта», дзе ён раскрывае гісторыю ўзнікнення лацінкі, паказвае яе перавагу і лічыць, што пераход на лацінскі алфавіт — неабходная ўмова паскарэння працэсаў адраджэння ў Беларусі. Тут жа чытач знойдзе правілы беларускага вымаўлення.

Пад рубрыкай «Беларускае замежжа» публікуюцца кароткія нататкі з жыцця беларускай эміграцыі, у прыватнасці, пра ўдзел беларусаў у канферэнцыі канадскіх славістаў, дэманстрацыю ў Нью-Йорку ў падтрымку В. Сядова, што адбылася 18 чэрвеня г. г., групу амерыканскіх беларусаў з Лос-Анджэлеса, якая звярнулася да прэзідэнта Буша з заклікам прызнаць незалежнасць Беларусі.

У нумары друкуюцца таксама выпісы з бягучага друку і лісты ад чытачоў.

Л. БАРШЧЭЎСКАЯ.

У Жодзіне адкрыта новая царква, пабудаваная мясцовымі народнымі ўмельцамі ў традыцыях паўночнарускіх храмаў усяго за дзевяць месяцаў.

Узведзена царква ў гонар святога архангела Міхаіла і асвечана Мітрапалітам Менскім і Гродзенскім Патрыяршым экзархам усея Беларусі Філарэтам. Мастак А. Марачкін, сам родам з гэтых мясцін, падарыў храму карціну Маці Божая ахвяр Чарнобыля.

НА ЗДЫМКУ: новая царква ў Жодзіне.

Фота Валерыя ***АЛЯШКЕВІЧА (БЕЛТА).***



Лякарня чараўніцы Потахі

БАРКУН ЛЕКАВЫ. Чай з напару кветак баркуну 30 г на 1 л кіпетню п'юць пры грудных хваробах па віннай чарцы (50 г) кожную гадзіну. Кветкі баркуну ў невялікіх дозах уваходзяць у розныя грудныя сумесі лекавых раслін.

МЕДУНІЦА (ШЧАМЯЛІЦА) ЛЕКАВАЯ І МЕДУНІЦА НЯЯСНАЯ. Народ ужывае дзве медуніцы як адхарквальны сродак пры бранхітах, запаленні слізістых дыхальных шляхоў і пры іншых грудных захворваннях, якія суправаджаюцца сухім кашлем і хрыпатой. Звычайна ўжываюць медуніцу ў напары 30—40 г на 1 л вады.

РАСЛІНЫ, ЯКІЯ ЎЖЫВАЮЦЦА Ў НАРОДЗЕ ПРЫ ЛЯЧЭННІ ХВАРОБ СКУРЫ, А ТАКСАМА РАН І БОЛЕК, ШТО ДОЎГА НЕ ЗАЖЫВАЮЦЬ.

Як і ў папярэдніх раздзелах, тут маюцца на ўвазе перш за ўсё хваробы, якія ўзнікаюць у выніку парушанага абмену матэрыі ў арганізме хворага чалавека.

КАШТАН КОНСКІ. Сок са свежых каштанавых кветак па 20—30 кропляў на 1 сталовую лыжку вады прымаюць 2 разы на дзень пры расшырэнні вен на нагах і пры апуханні гемараідальных гузоў. Пасля доўгага ўжывання соку кветак каштана гемараідальныя болі праходзяць, і, калі хвароба не запушчана, гузы знікаюць.

Сцвярджаюць, што хоць і слабей, але таксама дзейнічае сок з кветак, разбаўлены спіртам (1 частка соку на 2 часткі спірту); прымаюць па чарцы (30—40 г.) 3 разы на дзень.

Водны адвар кары галінак каштанавага дрэва, 50 г на 1 л вады, ужываюць для сядзячых ваннаў пры гемараідальных кровацячэннях, калі гузы яшчэ звонку (пры «вонкавым гемарої»). Ванна (прахалодная) на працягу 15 мінут. Для такіх жа ваннаў выкарыстоўваюць адвар кары галінак каштана і травы вадзянога перцу.

Пішам, вымаўляем

«Дазвольце падзякаваць вас...»

Гэтую фразу можна пачуць даволі часта і па радыё, прычым не толькі з Віцебска, але і з Менска, і па тэлебачанні. Мне, як і любому беларусу, яна «рэжа» вуха.

Але як зразумець карэспандэнта радыё ці тэлебачання, якi, беручы інтэрв'ю, заканчвае яго такой жа фразай. А калі яна гучыць у шаноўнай перадачы «Ліра», то і зусім няёмка. Перадача ж літаратурная! Не хочам вучыцца ці што?

Дзякуй!

І. ФУРСЕВІЧ.
г. Докшыцы.

«ЧАСОПІС»

З друку выйшаў чарговы нумар «Часопіса» (№ 10-11), які выдаецца ў Беластоку. «Праваслаўная старонка», якую рыхтуюць студэнты, адкрываецца «Кароткім нарысам кананічнага становішча праваслаўнай царквы беларускага народа».

«...Яшчэ адзін круты паварот, крыху пад горку і перад вачыма пачала прасцірацца шырокая панарама Мельніцкай зямлі: надбужныя лясы, Замкавая Гара і руіны касцёла св. Мікалая пад ею, крыху ніжэй купалы Багародзічнай царквы. Абедняе сонца грэла прыемна. Лета, хаця пад свой канец, аддавала належнае. Было 31 жніўня 1991 года...»—так пачынаюцца нататкі Міколы Сахарэвіча «Музычныя «маналогі» над Бугам» пра музычнае свята, якое адбылося на беразе Мельніка, які «застаецца месцам супольнага пражывання людзей розных светапоглядаў, нацыянальнай ці кансумпцыйнай свядомасці. Так было тут ад вякоў. Мельнік — гэта «своеасаблівы Вольны горад», асяродак узаемапранікнення пасяленчых плыняў з Палесся, Валыні, Чорнай Русі ці Мазовii. Таму перад Мельнікам стаіць перспектыва быць месцам сапраўдных дыялогаў культуры беларускай, украінскай і польскай.»


З цікавасцю чытаецца артыкул Ю. Весялкоўскага «Польска-украінскае Монтэ Касыно».

На гэты раз у «Часопісе» беларускамоўных матэрыялаў няшмат. Але, калі параўнаць «Часопіс» з некаторымі нашымі рэспубліканскімі выданнямі, якія змяшчаюць матэрыялы на дзвюх мовах, то ў «Часопісе» беларускамоўных не так ужо і мала.

В. Ш.

І смех, і грэх

ДЫЯЛОГІ НА ВЯСКОВАЙ ЛАЎЦЫ



— Чаму гэта наш старшынька забракаваў Федзькубрыгадзіра? Такі іспаніцельны быў, пакладзісты, начальству гадзіў. Сама бачыла, як танцаваў перад імі.

— Танцаваць то ён, Гэлечка, танцаваў, ды не кланяўся.

* * *

— За што толькі Бог пакараў Юрыка? Жонка, не пры нас кажучы, каторы год з ложка не ўстае, сам на старасць без ног застаўся. А яшчэ гэты сын п'яніца. Так ужо здзекуецца, так здзекуецца. Каб яго зямля не насіла!

— Праўду некалі казаў мой пакойны Міхась: вырасці сабе крумкача, дык ён табе і вочы выдзяўбе!

— А ці не тое ў Мані Казымеравай з дачкой? Матку ні ў грош не ставіць! Гэта ж дадумацца трэба: справадзіць старую ў веранздзе жыць! А яна, колькі помню, усё жыццё над гэтай дзёўчынай трэслася.

— Вот і выпесціла змейку на сваю шыйку.

* * *

— Сын Гарошыхі, як у каператары падаўся, дык як калядная ёлка прыбраўся. Ужо на машыне сваёй прыязджаў. Некай інпартнай. Казалі, руль з правага боку...

— І мацеры з бацькам усяго панавалакаў. Ходзіць па сяле — тычкай носа не дастанеш: жыць умее!

— Ну і што ўжо робіцца! Гультай жа несусветны, задрыпа і раптоўне «дастойным» чалавекам стаў.

— А ў цёмным месцы, Наста, і гніляк свеціцца.

* * *

— Думаеце, я праўды дабілася ў тым сельсавеце? Хаця каб... Хвігай нос падцёр мне начальнічак-дземакрат. Маёй бядой мяне яшчэ і высцебаў!

— А ты знайшла заступніча! Забылася, кім ён раней быў? Воўк то ліняе, ды нораву не мяняе.

Учула Любоў ***ЛАМЕКА.***

У свеце слоў

Галоснасць ці голаснасць?

У апошнія гады навукоўцаў непакоіць слова «галоснасць» — калька з рускага слова «гласность» — пушчанае кімсьці ў абыходак на пачатку перабудовы. Выступленні некаторых пісьменнікаў, напрыклад Янкі Брыля, актывізавалі такія адэкваты як «публічнасць», «адкрытасць». Аднак не-не, ды і прамільгне ў друку «галоснасць». Нават і ў «Нашым слове». А ці правамерна яно ўжываецца? Звернемся да супастаўлення аднакаранёвых слоў «глас», «гласить», «гласно» (гласность) з беларускімі адпаведнікамі. Паводле Руска-беларускага слоўніка (другое дапоўненае выданне, 1982): *глас — голас; гласить — апавяшчаць, абвяшчаць, гаварыць, казаць; гласно (гласность) — публічна і публічнасць.*

Ёсць яшчэ рускі прыметнік «гласный», адно з яго значэнняў у беларускай мове такое: «адкрыты», «публічны»: *гласный суд — публічны суд*. Выходзіць, што слову «гласность» не адпавядае па сэнсу яго аўтаматычна-механічны пераклад на беларускую мову («галоснасць»). Магчыма, такому перакладу спрыяюць словы «голас», «галасаваць», «галасісты», «галасістасць», «галасны» і інш. Але гэта ўжо, як гаворыцца, «голас» з іншай оперы. Бо *глас* — гэта *голас*, *гласно — голасна, уголас, у публічна адкрытай форме*, а *гласность* — гэта *голаснасць, публічнасць, адкрытасць*. Як і *доказнасць, колернасць, роздумнасць, тоеснасць*.

Мікола АБАБУРКА.
г. Магілёў.

Пародыя

АДВЕЧНАЯ ТЭМА

Аляксей Ненадавец

Носіць матуля вязкамі
Водар лугоў з гумна...
Мова мая славянская
Жывіцца там здаўна.

«Спадчына — песня матчына»
М. Скобла.

Доля мая сялянская:
Конік, кароўка адна,
Сена з-пад лесу духмянае,
Так павялося здаўна.
Маці, галубка сівенькая,
Корміць жывёлу з рання.
Носіць ёй велькімі вязкамі
Водар лугоў з гумна.
Мова мая славянская
Жывіцца там ад веку...
І Муза галодная хрумстае:
Паранку, бульбу і віку.
Яшчэ канюшыну садовую
Змешваю ёй з буракамі,
(Як добра яна падсілкуецца,
Дык з месяц трашчыць радкамі!).
Ну, а ў хвіліну вольную,
Думаю думу адну:
А раптам праз дзверы гуменца
У класікі заўтра сягну?

ПЫТАННІ

* Ці можа быць светлая будучыня з цёмнага мінулага?

* Як спець лебядзіную песню, калі табе мядзведзь на вуха наступіў?

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ-ПЕРАКЛАД, ЗМЕШЧАНУЮ Ў № 43

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Жыгучка. 4. Палясоўшчык. 6. Здалёк. 7. Айчына. 9. Попыт. 10. Вазоўня. 12. Абраз. 14. Екат. 15. Ягня. 16. Шчыры. 17. Сталы. 21. Развага. 23. Енчыць. 26. Ткалля. 28. Аглядальнік. 29. Кавадла.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Жыллё. 2. Удоўж. 3. Адчай. 4. Пласт. 5. Крыха. 6. Запазычанне. 8. Абрабаваны. 9. Птушаня. 10. Вакамер. 11. Ячнішча. 13. Забыццё. 18. Газа. 19. Апад. 20. Сучча. 22. Шалік. 24. Цалік. 25. Крама. 27. Конна.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Рэдактар Эрнэст Ялугін.

Сябры калегіі: Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Ніл Гілевіч, Уладзімір Дамашэвіч, Алесь Камароўскі, Анатоль Клышка, Алег Куліцкі, Уладзімір Ламека, Уладзімір Содаль, Алесь Траяноўскі, Генадзь Тумаш, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Міхась Шавыркін.

Адказны сакратар Анатоль Сілянкоў.

Наш адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13.

Тэлефон рэдакцыі: 33-17-83.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара неабавязкова можа адпавядаць меркаванню рэдакцыі.

Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

МВПА імя Якуба Коласа.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка».
Наклад 5.058 паасобнікі. Зак. 2473. Індэкс 74975.